УДК 316.7:39(476)

# РЫТУАЛ, АБРАД, КУЛЬТУРА: ПАСТАНОЎКА ДАСЛЕДЧАГА ПЫТАННЯ

**_А. Д. Крывалап,_**
*кандыдат культуралогіі, прафесар кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** Тэкст прысвечаны разгляду пытання актуалізацыі ў межах культуралогіі даследаванняў рытуалаў і абрадаў, якія знаходзяцца ў падмурку культуры. Разглядаюцца наяўныя даследаванні рытуальных практык беларускімі навукоўцамі. Аналізуюцца лінгвістычныя асаблівасці моўных практык даследчыкаў рытуалаў і абрадаў. Дадзены тэкст з'яўляецца спробай пастаноўкі даследчага пытання ў падыходах да даследавання сучаснага стану рытуальных практык канструявання культурнай ідэнтычнасці.

**Ключавыя словы:** рытуал, абрад, практыка, мова, культурная ідэнтычнасць.

# RITUAL, RITE, CULTURE: FORMULATION OF THE RESEARCH QUESTION

**_A. Kryvalap,_**
*PhD in Cuturology, Professor of the Department of Cuturology, Psychology, and Pedagogy of the Institute for Advanced Studies and Retraining of Personnel of the Educational Institution «Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The text is devoted to the consideration of the issue of actualization within the framework of cultural studies of rituals and ceremonies that underlie culture. The article examines the existing research on the ritual practices of Belarusian scientists and analyzes the linguistic features of the language practice of researchers of rituals and rites. This text is an attempt to pose a research question in approaches to studying the current state of ritual practices of constructing cultural identity.

**Keywords:** ritual, rite, practice, language, cultural identity.

Адной з базавых катэгорый сучаснай культуралогіі з’яўляецца рытуал як падмурак для пабудовы і далейшага канструявання культуры. Гэта звязана не толькі з рэлігійнымі культамі, міфалогіяй і вераваннямі, але і з рытуалізацыяй сацыяльна-культурнага жыцця ва ўмовах грамадства спажывання. Можна ўпэўнена сказаць, што з рытуалаў складаюцца абрады, з якіх у сваю чаргу далей пачынае фарміравацца культура. Фактычна рытуальныя дзеянні ў шырокім сэнсе і з’яўляюцца тымі элементамі, што ствараюць культуру.

Аднак у той жа час даследаванні рытуалаў на сённяшні дзень маюць досыць маргінальны характар і дакладна не адносяцца да акадэмічнага мэйнстрыму. Вядома ж, можна выказаць меркаванне, што за дзве тысячы гадоў вывучэння культуры і чалавецтва ўсё, што можа быць звязана з рытуаламі, ужо даследавана. Аднак гэтая думка не вытрымлівае праверкі рэчаіснасцю, калі новыя рытуалы з’яўляюцца разам з новымі сродкамі камунікацыі, ствараючы і новыя практыкі спажывання. Такім чынам, можна паспрабаваць знайсці адказ на пытанне: чаму сучасная культуралогія даследуе ўсё што заўгодна, але не рытуалы?

Мэта артыкула – паказаць перспектыўнасць даследавання рытуалаў сродкамі і метадамі культуралогіі на прыкладзе медыяспажывання.

У базе аўтарэфератаў ВАК Беларусі на сённяшні дзень прысутнічаюць толькі чатыры кандыдацкія дысертацыі, назвы якіх звязаны з рытуаламі і абрадамі. Адзін аўтарэферат А. М. Аўласовіча «Погребальная обрядность на территории Могилевского Поднепровья и Посожья в X–XIII вв.» [1], па спецыяльнасці «Археалогія». Два аўтарэфераты па філалогіі: М. А. Шатарова «Беларуская аказіянальная абраднасць як адметны тэкст: змест, функцыя, семантыка» [4] і Чжан Х. «Семейно-обрядовый фольклор белорусов и китайцев в компаративном аспекте» [3]. І адзін аўтарэферат па культуралогіі А. В. Катовіч «Увасабленне феномена часу ў міфапаэтычнай і рытуальна-абрадавай спадчыне беларусаў» [2]. Можна сказаць, што пры такім ахопе тэм і не самай шчыльнай насычанасці разнастайнасці даследаванняў тут дакладна застаецца месца для далейшых пошукаў.

Магчыма, што база аўтарэфератаў ВАК улічвае толькі дысертацыі, што былі абаронены ў XXI ст., але не ўтрымлівае звестак пра ранейшыя працы. Аднак і гэты аргумент не з’яўляецца пераканаўчым, каб ігнараваць даследаванне рытуалаў як істотнага складніка культуры. Таксама варта звярнуць увагу на тое, што даследуецца і публікуецца на іншых мовах пра рытуалы і абрады. З дапамогай сэрвісу, які дазваляе візуалізаваць частотнасць выкарыстання тых ці іншых слоў у публікацыях Google Books Ngram Viewer

(https://books.google.com/ngrams), былі зроблены запыты на англійскай і рускай мовах: «ritual – rite» і «ритуал – обряд» за перыяд часу з 1800 па 2019 г. уключна. Вынік візуалізацыі кольккасці публікацый пададзены ніжэй.






Галоўнае адрозненне, якое адразу заўважна, – гэта тое, што ў большасці выпадкаў на англійскай мове даследуюцца і апісваюцца рытуалы, а на рускай – абрады. Выкажам спекулятыўнае меркаванне, што аднолькавыя тэрміны ў розных мовах маюць неаднолькавыя канатацыі пры выкарыстанні. Магчыма, што ў рускай мове рытуальнасць больш звязваецца з прымітыўнымі культурамі, а даследаванне абрадаў дазваляе падняцца на прыступку вышэй, да больш складаных форм арганізацыі культуры. Таксама нетыповы ўздым цікаўнасці да абрадаў у сярэдзіне XX ст. можна патлумачыць негатыўным стаўленнем у СССР да рэлігійных рытуалаў і станоўчым – да вывучэння народных абрадаў. Аднак нават гэтая інфармацыя паказвае цяжкасці «перакладу» і разумення даследаванняў рытуалаў і абрадаў. Культуралогія можа паспрабаваць знайсці больш аргументаваныя тлумачэнні папулярнасці вывучэння абрадаў і рытуалаў у залежнасці ад моўнай карціны свету даследчыкаў.

Культуралогія не будзе самотнай у гэтай спробе зразумець сувязь паміж рытуаламі і культурай. Для сацыялогіі культуры гэта таксама будзе актуальным. Для сацыялогіі значнасць рытуалаў абгрунтоўваецца тым, што іх вызначэнне было істотна пераасэнсавана і закранала сферу сацыяльнага, калі любая праява сацыяльнага жыцця магла быць канцэптуалізавана як своеасаблівая форма рытуалу. С. Люк прапануе аўтарскае сацыялагічнае вызначэнне рытуалу: «Кіруемая правіламі дзейнасць сімвалічнага характару, якая прыцягвае ўвагу ўдзельнікаў да аб’ектаў думкі або пачуццяў, якія яны лічаць асабліва важнымі» [5, p. 291]. Ф. Эліот удакладняе два аспекты ў папярэднім вызначэнні. Па-першае, «сам рытуал – гэта структураванае прадстаўленне, у якім усе ўдзельнікі няроўныя. Па-другое, <...> рытуал мае “сімвалічны характар” і заснаваны на “аб’ектах думкі або пачуццяў”, якія маюць “асаблівае значэнне”» [6, p. 145]. У сучасным грамадстве няма рытуалаў, якія б грунтаваліся на абсалютнай веры ў тое, што бездакорнае выкананне сацыяльных роляў нейкім звышнатуральным чынам можа паўплываць на наш росквіт і адзінства. Але пры гэтым існуе шмат разнастайных цырымоній, якія сведчасць пра адзінства. Пры гэтым істотная частка падобных цырымоній, што складаюцца з больш дробных рытуалаў, можа адбывацца ў медыяпрасторы ці мець выключна віртуальны характар. С. Котл прапануе наступнае вызначэнне медыятызацыі рытуальных дзеянняў: «Медыятызаваныя рытуалы – гэта выключныя і перфарматыўныя медыяфеномены, якія служаць для падтрымання і / або мабілізацыі калектыўных пачуццяў і салідарнасці, заснаваныя на сімвалізацыі і ўмоўным разуменні таго, што і як павінна быць» [7, p. 415].

Вывучэнне медыйных рытуалаў такім нефункцыяналістычным спосабам – гэта супрацьлегласць вылучэнню асобных момантаў і павышэнню іх асаблівага, нават «магічнага» значэння. Але даследаванні спажывання медыя як рытуальнай практыкі – гэта тэма для іншага даследавання.

Можна падвесці некаторыя папярэднія вынікі. Даследчае пытанне для культуралогіі ў кантэксце вывучэння рытуалаў можа быць сфармулявана ў наступным выглядзе: якім чынам магчымы рытуальныя дзеянні, якія пазбаўлены рацыянальнасці? Рытуалы як практыка могуць быць пазбаўлены логікі і рацыянальнасці. Гэта не магічны спосаб камунікацыі з вышэйшымі сіламі прыроды ці духамі, а проста доказ наяўнасці ўласнага існавання ў медыяпрасторы праз перфарматыўную дзейнасць. Гэта чыстыя формы практыкі, што сцвярджаюць сапраўднасць уласнага існавання і адначасова з гэтым садзейнічаюць канструяванню культурнай ідэнтычнасці.

1. *Авласович, А. М.* Погребальная обрядность на территории Могилевского Поднепровья и Посожья в X–XIII вв. : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.06 / А. М. Авласович ; Ин-т истории НАН Беларуси. – Минск, 2017. – 30 с.

2. *Катовіч, А. В.* Увасабленне феномена часу ў міфапаэтычнай і рытуальна-абрадавай спадчыне беларусаў : аўтарэф. дыс. ... канд. культуралогіі : 24.00.01 / А. В. Катовіч ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2022. – 28 с.

3. *Чжан, Х.* Семейно-обрядовый фольклор белорусов и китайцев в компаративном аспекте : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.01.09 / Х. Чжан ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 2020. – 34 с.

4. *Шатарова, М. А.* Беларуская аказіянальная абраднасць як адметны тэкст: змест, функцыя, семантыка : аўтарэф. дыс. ... канд. філал. навук : 10.01.09 / М. А. Шатарова ; Беларус. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка. – Мінск, 2022. – 30 с.

5. *Lukes, S.* Political ritual and social integration / S. Lukes // Sociology. – 1975. – Vol. 9. – № 2. – P. 289–308.

6. *Elliott, P.* Press performance as political ritual / P. Elliott // The Sociological Review. – 1981. – Vol. 29. – № 1_suppl. – P. 141–177.

7. *Cottle, S.* Mediatized rituals: Beyond manufacturing consent / S. Cottle // Media, Culture & Society. – 2006. –Vol. 28. – № 3. – P. 411–432.